**ДОЎГІ ЛОГ** — вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце , за 16 км на захад ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў— Сураж, 176 км ад Магілёва, на р. Дзяражня (прыток р. Бесядзь). Побач аўтадарога Краснаполле — Хоцімск.

Вядома з 18ст. У 1747 г. вёска (13 двароў) у Крычаўскім старостве, уласнасць казны. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) – у складзе Расійскай імперыі. У 1799 **г.** у вёсцы 22 двары, 131 жыхар, у аднайменным фальварку — 1 двор, 39 жыхароў. Памешчык меў тут і ў суседніх вёсках у 1864 г. 2000 дзесяцін зямлі, 2 вадзяныя млыны, сукнавальню і карчму. З 1895 г. дзейнічаў вінакурны завод (4 рабочыя). У 1919 г. у фальварку створана камуна «Чырвоны Кранштат». З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. ў Касцюковіцкім раёне. У Вялікую Айчынную вайну 30.09.1943 г. вызвалена ад нямецка–фашысцкіх акупантаў.

Паводле перапісу 1959 г. — 258, у 1970 г. – 186 жыхароў. У 1986 г. – 42 гаспадаркі, 103 жыхары, у складзе калгаса «Кранштат», працаваў магазін. Галоўная вуліца шыротнай арыентацыі праходзіць паралельна аўтадарозе. Да яе перпендыкулярна з поўначы далучаюцца тры кароткія вуліцы. Забудавана двухбакова драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу.